З перадачы, 21/XII што была, атрымаў яду і бялізну. Шчыра і моцна дзякую, любыя мае.

Адсылаю брудную бялізну: рубашку, 2 сарочкі, 2 кальсон, 2 хустачкі, 2 п. шкарпэтак, 2 анучкі, 1 галаўную хустку, 1 сетку, 1 наўлачку і торбу.

Я здароў і ня куру. Папярос ня трэба. Як жывяце і ці здаровы вы, дарагія мае? Ці атрымала ты, Анечка, дзьве даверанасьці, адна на перавод паю, а другая на атрыманьне грошай з ашчадкасы? Ці вялікія вырасьлі мае слаўныя дзетанькі? Тата іх моцна–моцна любіць, вітае і цалуе Лорачку і Лялячку.

Кніг я не атрымаў.

Моцна цалую Вас усіх.

Ваш *Адам*.

Анечка, прышлі нафталіну.

## № 33. Ганьне Бабарэцы

*7/I–1931 г.*

Дарагая мая любая Анечка!

Перадачу яды, бялізны і курава, што была 30 сьнежня, атрымаў. Шчырае і вялікае дзякуй, і за курава таксама.

З бялізны адсылаю: сарочку, кальсоны, сетку, прасьціну, ручнік, наўлачку, хустачку, 2 пары шкарпэтак, анучкі і торбу.

Я здароў, моцны і бадзёры. Ці здаровы вы ўсе і як гадуюцца мае слаўныя, любыя і дарагія дзетанькі — Лорачка і Лялячка?

Паліто зімовага пакуль што ня трэба. Прышлі, любая, з пару зубачыстак і чыстае паперы з дзясятак аркушаў.

З кніг я атрымаў: самоучитель Шмелева, 2 кніжачкі Гайне, слоўнік і кніжку Рэмарка. Вялікае і шчырае дзякуй, любая Анечка.

Пасылаю табе даручэньні на атрыманьне грошай з ашчадкасы і паю з „Камунар[а]–асьветніка“, а таксама заяву ў праўленьне гэтага ЖАКТу.

Моцна–моцна цалую Вас усіх.

Ваш *Адам*.

## № 34. Ганьне Бабарэцы

*14/I–1931 г.*

Дарагая і любая Анечка!

Перадачу, што была 7/I, атрымаў, шчыра і моцна дзякую, родная.

Адсылаю бялізну: сарочку, кальсоны, прасьціню, пошаўку, хустачку, 2 пары шкарпэтак, анучкі.

Даручэньні на грошы і перавод паю ў МЦРК паслаў праз сьледаваценя. Пабачэньня таксама прасіў.

Пай з ЖАКТ „Камунар–асьветнік“, калі трудна з грашыма, забяры назад.

Як Вы жывяце? Ці здаровы? Як гадуюцца мае слаўныя дзетанькі, Лорачка і Лялячка, ці вялікія?